***К. В. Ліплянская***
*Навуковыя кіраўнікі:*
***А. М. Аксёнаў***
*Беларускі гандлёва-эканамічны*
*ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі*
*г. Гомель, Рэспубліка Беларусь*
***Т. М. Кавалеўская***
*Сярэдняя школа № 11*
*г. Рэчыца, Рэспубліка Беларусь*

# МОЙ ПРАДЗЕД – МОЙ ГОНАР

Семдзясят пяты год пайшоў з таго часу, як была вызвалена тэрыторыя Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Не вярнуліся з фронту дзяды, бацькі, сыны. Баліць сэрца ў тых, хто не дачакаўся сваіх родных з фронту. Можна жыць і працаваць далей, але ніколі не загояцца раны ў сэрцы. Вайна паступова адыходзіць у мінулае, становіцца старонкай у падручніку гісторыі. Няма ў нас ніводнай сям’і, на якую б ні паўплывала вайна. Ад Брэста да Масквы 1 000 км, ад Масквы да Бярліна 1 000. Разам будзе 2 600 км. Чатыры доўгія гады! 1 418 дзён. Трыццаць чатыры тысячы гадзін!

Гітлераўцы хацелі ўсю Беларусь аблытаць калючым дротам, знішчыць наш народ. Спалена і разбурана 9 200 беларускіх вёсак, 209 гарадоў, сцерта з твару зямлі разам з усімі жыхарамі 627 паселішчаў. На зямлі Беларусі гітлераўцы загубілі больш трох мільёнаў людзей. Кожны трэці беларус не ўбачыў сцяг Перамогі.

Раны вайны залечаны, але мы ніколі не павінны забываць, якой цаной здабыты мір. Маладое пакаленне нашай краіны ўяўляе вайну па ўспамінах ветэранаў, па кадрах кінахронікі, па творах мастацкай літаратуры. Мы захапляемся мужнасцю абаронцаў Брэсцкай крэпасці, удзельнікаў баёў пад Масквой, Сталінградам, Курскам. Нашай сям’і пашанцавала, бо з фронту вярнуўся мой прадзед Мікалай Іванавіч Ліплянскі, удзельнік Сталінградскай бітвы (малюнкі 1–2).



Малюнак 1 – **Партрэт Мікалая Іванавіча Ліплянскага**



ВОЕННЫЙ БИЛЕТ
НБ № 0854001
Фамилия Липлянский
Имя Николай
Отчество Иванович
Число, месяц и год рождения 30.III.1924
Личная подпись владельца
Выдан
военным комиссариатом
области (республики)
19 ноября 1963 г.
ВОЕННЫЙ КОМИССАР
М. П.

НБ № 0854001 1
I. Общие сведения
1. Место рождения
2. Национальность белорус.
3. Партийность (с какого года)
4. Состоит ли в ВЛКСМ (с какого года)
5. Образование
6. Основная гражданская специальность шофер
7. Семейное положение женат

8
19. Военную присягу принял 8 августа 1942 года
при
(наименование части)
М. П. Нач. штаба части
(звание, подпись)
20. Присвоение воинских званий и классности по специальности

| Присвоено воинское звание или классная квалификация | Кем присвоено, дата и номер приказа | Подпись и печать |
|---|---|---|
| рядовой | | |

21. Правительственные награды и награждения нагрудными знаками и ценными подарками Орд. Красной звезды
Медали: за оборону Сталинграда, за победу над Германией, за взятие Берлина, за освобождение Праги. Медаль: 20 лет победы в ВОВ 1941-1945 г. 30 лет Победы в ВОВ 1941-1945 г. 40 лет Победы в ВОВ 1941-1945 г. Орден Отечественной войны I ст.
22. Какие имеет ранения и контузии (дата и характер ранения (контузии))
7.8.1943 г. – тяжело ранен
29.01.1945 г. – тяжело ранен в прав. кисть.

Малюнак 2 – **Ваенны білет Мікалая Іванавіча Ліплянскага**

Ён вызваляў ад фашысцкай навалы сталіцу Чэхаславакіі Прагу, сталіцу Венгрыі – Будапешт. Яго ваенная дарога пачалася ў ліпені 1942 г. і закончылася ў маі 1945 г.

Мой прадзед нарадзіўся 20 сакавіка 1924 г. у маленькай вёсачцы Габрылееўка Нараўлянскага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў 6 класаў Нараўлянскай фабрычна-заводскай школы ў 1939 г. Працаваў у калгасе, дапамагаў па гаспадарцы сваім бацькам. У жніўні 1942 г. прыняў ваенную прысягу ў Пугачоўскім ваенным камісарыяце Саратаўскай вобласці. Васямнаццацігадовым юнаком ён стаў на абарону роднай зямлі. Служыў мой прадзед у сёмым кавалерыйскім корпусе.

Крок за крокам праз усе жахі выпрабаванняў, страты, боль і смутак набліжаў наш народ Перамогу. За час вайны Мікалай Іванавіч быў тройчы паранены. Атрымаў дзяржаўныя ўзнагароды: ордэн Чырвонай Зоркі, медалі за абарону Сталінграда, вызваленне Прагі, за ўзяцце Берліна, за Перамогу над Германіяй, шэраг юбілейных медалёў пасля вайны, ордэн Айчыннай вайны ІІ ступені. Гэтыя ўзнагароды і зараз захоўваюцца ў нашай сям'і як найкаштоўнейшы скарб.

Мікалай Іванавіч вярнуўся ў родную вёску ў сакавіку 1946 г. Працаваў шафёрам на Кіраўскім лесаўчастку. Ажаніўся з Леанідай Адамаўнай Садоўскай. У іх сям'ї нарадзілася трое дзяцей. Калі дзеці падраслі, кожны год на Дзень Перамогі мой прадзед расказваў пра жорсткія баі за вызваленне нашай краіны ад фашыстаў. Са слязамі на вачах ён успамінаў абарону Сталінграда.

Для зусім яшчэ маладога байца Сталінград назаўсёды застанецца такім, якім ён убачыў яго у тую туманную жнівеньскую раніцу. Вось што расказваў Мікалай Іванавіч пра тыя цяжкія дні: "Гэта быў горад руін. Нават у самы сонечны дзень быў прыцемак, бо сонейка было ахутана дымам пажараў і разрываў. Цэлыя суткі гул разрываў, снарадаў і бомбаў зліваўся ў адзін пранізлівы гром. Байцы самаадданна змагаліся з ворагам. Параненыя не пакідалі поле бою. Страціўшы правую руку, змагаліся левай. Тыя, хто быў паранены ў нагу, паўзком перадавалі патроны. Перад салдатамі стаяла задача, абараняючыся ў паласе шырынёй 520 км, спыніць далейшы рух непрыяцеля. Асноўныя намаганні фронту былі скіраваны каля выгіну ракі Дон, каб не даць ворагу фарсіраваць яе, тым самым, прарвацца ў горад. У выніку настойлівай абароны 62-й і 64-й армій і контрудараў злучэнняў першай і чацвёртай танкавых армій задума ворага была сарвана. Да 10 жніўня нашы войскі адышлі на левы бераг Дона, занялі абарону на знешнім абводзе Сталінграда і спынілі рух ворага. Зямля гарэла пад нагамі фашыстаў. Яшчэ не раз яны наладжвалі атакі, якія заканчваліся поўным правалам. З 19 лістапада 1942 г. пачалася наступальная аперацыя савецкіх войскаў. У выніку іх контрнаступлення пад Сталінградам нямецка-фашысцкія войскі былі адкінуты далёка на Захад ад Волгі. Сталінградская бітва – адна з самых вялікіх у Другой сусветнай вайне. Яна працягвалася 200 дзён. Гэта быў важнейшы этап на шляху да Перамогі над фашысцкім блокам".

Мікалай Іванавіч памёр у 2006 г., але памяць пра яго гераічнае мінулае захоўваецца ў нашай сям'і да гэтай пары. Пахаваны ён на могілках у вёсцы Габрылееўка. Мы часта ўспамінаем нашага дарагога, паважанага і любімага прадзеда, дзядулю і бацьку Мікалая Іванавіча. Ён для нас з'яўляецца прыкладам мужнасці, адданасці, смеласці.

Сённяшняй цішыней, бесклапотным дзяцінствам мы абавязаны Вялікай Перамозе. За тое, што на світанні чуем песні жаўрукоў, што радуемся дажджу і снегу, што вочы свецяцца шчасцем, хацелася б сказаць вялікі дзякуй і нізкі паклон вам, радавыя Вялікай Айчыннай вайны. Мы ганарымся сваім прадзедам і тымі, хто набліжаў Вялікую Перамогу.